Цэна асобнага нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень

Адрэс рэдакціі і адміністраціі: Вільня, Віленская вул., № 29

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г. 2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцай: на 1 г — 4 р на 6 мес — 2 р 3 мес. — 1 р. Перамена адрэсу — 20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі. Рукапісы і карэспандэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ падпісаць прозвішча разам з фаміліей, хто не захочэ, каб была надрукавана праўдзівая фамілія Адрэс і фамілія тэлькі для ведама рэдакціі. Рукапісы аўторам не вертаюцца назад

Год IX. 21 Лютаго 1914 г. № 8

*Пры гэтым нумэры усім падпісчыкам разсылаецца*

**Спісак беларускіх кніжэк і часопісоў.**

## Вялікая гадаўшчына.

53 гады таму назад, 19 лютаго 1861 году, быў падпісан маніфэст каторы касаваў няволю селянства прыгон; маніфэст, паводле каторага дзесяткі мільёноў нявольнікоў сталіся людзьмі. Так... сталіся людзьмі, бо перад тым яны былі панскай рэччу, таварам, каторы купляўся, прадаваўся і меняўся.

Гэткіе парадкі трывалі праз цэлые векі і толькі у 1861 г. ім прыйшоў канец. Усе лепшые і справядлівые людзі добра разумелі, што гэтак быць не павінна, што селяне такіеж людзі як і паны і яны маюць права на ўсё што належыцца вольнаму чэлавеку. Гэткіе думкі усё болей ды болей шырыліся; нават некаторые вялікіе чыноўнікі і паны, каторые самі мелі падданых, сталі згаджацца з гэтым. Але ўсё-ж такі агромная большасць паноў і слухаць не хацела аб скасаваньні прыгону, і трэба было шмат другіх прычын каб гэта рэформа збылася. У канцы шмат дзе падданые бунтаваліся, нападалі на двары і інш. На гэта звярнуў увагу сам Цар Александар II: на некольві гадоў перад скасаваньнем прыгону. ён сказаў зьехаўшымся у Маскву паном—«лепей мы дамо волю народу з верху—чым ён яе сам да будзе зысподу».

Вось дзеля гэтых і др. прычын і надумаліся асвабадзіць селян. Асвабадзілі не зусім так, як жадалося народу і тым людзям якіе за яго заступаліся: зямлі далі помала, налажылі на яе вялікі выкуп, аж да 1904 г. да мужыцкай сьпіны мела права воласьць, над народам паставілі гэтулькі начальства, што калі мужык у вершы беларускага паэты Богушэвіча („Быў у чысцы“), надумаўся перэлічыць новых паноў то на гэты лік не хапіло пальцоў і вышло, што цяпер „паноў“ ня меней як за прыгону.

Але як бы там не было вялікую перамену зрабіў маніфэст 19 лютаго, вялікую ён цяжасць з народу зняў. Шмат чаго благога, што было перш, цяпер німа. Асвабоджэньне с панскаго падданства. гэта першы крок па дарозі да лепшай будучыны. За ім, раней ці пазней, дажджэцца народ таго, што хоць некалі бедната, цемната, уся злыбеда цяперэшняя счэзнуць, што лепей ён зажывець. І заўсягды народ будзе памятаць той дзень у які пала яго целесная няволя і 19 лютаго для народу заўсёды будзе вялікай гадаўшчынай

Сьвяткуючыж гадаўшчыну 19 лютаго наш народ павінен верыць у тое, што як 53 гады таму назад пала яго целесная няволя, так калісь падзе і яго духоўная няволя: што дажджэцца наш—народ таго часу, калі яго душа, мова, будзе асвабоджэнена с пад «прыгону» у якім многа вякоў знаходзіцца

Г—к.

## Бяздомные.

Каб знайсці на Зямлі Матцы роўна нешчасьлівую старонку як Беларусь і роўна бяздольны народ як Беларусы, трэба далёка шукаць прыкладоў..

Трэба мысьлю перэнясьціся у далёлую Азію, за высокіе небатычные горы і спыніцца у шалёна багатай старонцы каторую амываюць сьвятые воды рэкі Гангу; трэба шукаць прыкладу у старонцы званай раем зямным—у Індіі.

Во там мы пабачым многа сходнаго з Беларусьсю.

Там, як і у нас, людзі раздзеляюцца на лепшых, горшых і найгоршых; тым як і у нас адвечные жыхары Індіі сталіся «нячыстымі» парыямі, каторые „да чыстых“, не занечышчаючы іх. могуць толькі на 10 крокоў прыбліжацца і не маюць права маліцца у сваей «нячыстай» мове Богу.

У багатай Індіі, дзе ураджай сам 200 бывае. дзе прырода вылíліла усе свае сілы, каб забаспечыць быт чэлавека. там парыі што году выміраюць дзесяткамі тысяч душ ад голаду і хвароб.

Гэтак дзеецца у далёкай Індіі, над сьвятымі водамі рэкі Гангу, блізка што гэтак дзеецца і у нашай Сьвятой Беларусі.

І у Беларусі адвечные жыхары і іх мова, сталіся „нячыстымі“.

І у Беларусі што году вымірае народ ад хвароб і голаду.

Хто унікнуў у страшэнную трагедію беларускаго народу, хто прайшоў душой, разам з ім, голгороду мук яго, таго нішто ня здзівіць, нават самае страшнае з жыцьця Беларуса.

Ня здзівіць таго, калі прачытае у газэтах звестку, што каля Вязыні, ці у Піншчыне выміраюць людзі ад тыфу, што у могілеўшчыне бацька зарэзаў нялетак дзяцей сваіх, а пасьля жонку і сябе бо... не было чаго есьці..

Ня здзівіць таго і тое, калі даведаецца з газэт, што параход павёз у Конго (апошніе вескі) 230 беларусоў работнікоў, прададзеных калішскай эміграцкай канторай па 80 руб. за галаву, на немінучую сьмерць, бо клімату тамтэйшаго не вытрымліваюць нават народы праз доўгіе пакаленьня прывыкшые да жары.

Ня здзівіць такжэ, калі пачуе, што перэсяленцы з могілеўшчыны і Міншчыны, загнаные у Сібірскую тайгу, у 25 пасёлках, пагалоўна усе хворы і выміраюць (апошніе вескі).

Хто ведае варункі жыцьця беларусоў і палітыку культуртрагероў і апекунноў,—нашых старшых «культурных братоў»,—каторая засуджае беларусоў на нацыональную сьмерць, той, кажу, усяму гэтаму ня здзівіцца Бо гэта толькі выснавак, немінучы рэзультат зверху укартаванай палітыкі, ка-

## Тарас Шэвчэнко.

'Эх! і нам будзь бацькам мілым,
Украінчэ слаўны!
Плывучы ў даль твая песьня
Гасьцінцам ня вузкім,
Нашла водгалас пачэсне
Ў сэрцы беларускім.“
(*Янка Купала „Памяці Шэвчэнкі“*).

I.

100 гадоў таму назад, 25 лютаго 1815 году, радзіўся найвялікшы украінскі паэт—Тарас Шэвчэнко. Радзіўся ён у беднай селянскай хаці, у Звенігародзкім павеці,—у Кіеўшчыне. Бацька яго быў падданым пана Энгельгардта Багата уселякай злыбеды перанёс Тарас у убогай мужыцкай сямьі, тым болей, што ён с самаго пачатку быў ня гэткі як усе селянскіе дзеці, а нейкі інакшы: усё ён меў ахвоту малеваць і да работы быў не здацен. Калі Шэвчэнку было 16 гадоў яго забралі за паслугача у панскі двор. Пан мала калі быў дома а ўсё найболей ездзіў па гарадох і цягаў с сабой Тараса. Хлапец свабодным часам, калі ніхто гэтаго не бачыў, пробаваў малеваць. Адзін раз калі ён позна у начы пры лямпе малеваў — яго злавіў пры гэтым пан. Хлапца, затое што, ёнпа начы з агнём сядзіць балюча вылупілі бізуном, але пан пабачыўшы, што малюе ён нішто сабе, аддаў у навуку да маляра. Шэвчэнко пабыў у аднаго маляра, а калі пан пераехаў у Піцер дык аддаў яго да другога. Маляр пасылаў свайго вучня малеваць столі, падлогі, платы і т. п.

Вечарамі, маючы свабодны час, Шэвчэнко бегаў у Летні сад дзе было шмат статуй з мармуру і глядзеў на іх. Вось адзін раз яго пры гэтым надыбаў артыста-маляр Сошэнко, так сама украінец. Сошэнко распытаўся Тараса хто ён такі і што робіць; пабачыўшы, што Шэвчэнко добра малюе, пазнаёміў яго з добрымі і разумнымі людзьмі.

У гэтай кампаніі Шэвчэнко шмат чаго навучыўся, багата кніг прачытаў ды стаў задумывацца над тым, ці справядлівы гэткі парадак калі адзін чэлавек пануе над другім.

Новые апекуны Шэвчэнкі хацелі аддаць яго у Акадэмію, каб выйшоў з яго праўдзівы артыст-маляр. Але для гэтаго трэба было выкупіцца с панскай няволі. Пан хацеў выкупу ажно 2500 рублёў,—гэткіх вялікіх грошы не было аткуль узяць. Але прыяцелі парупіліся, сабралі гэтые грошы і выкупілі ткі Шэвчэнка у 1838 г. Тагды ён стаў хадзіць у Акадэмію вучыцца.

Нішто сабе малеваў Шэвчэнко і у гэтым ён такжэ здабыў сабе славу, але куды большую славу здабыў ён сваімі вершамі. Ўжо будучы свабодным чэлавекам Шэвчэнко стаў пісаць вершы і пісаць іх не „па панску“, а «простай», роднай украінскай мовай. У 1840 гаду выйшоў у сьвет першы зборнік яго вершоў, а на другі год паэма „Гайдамакы“.

Зрабіўшыся праўдзівым артыстам малярам і маючы ужо не абы якую славу, паэта Шэвчэнко стаў старацца каб асесьці у сваей роднай Украйне. Гэта яму і удалося; асеў ён у Кіеві, дзе і работу дастаў па душы. У гэты час шмат чаго напісаў паэт. Талент яго акрэп і развіўся.

У Кіеві сярод разумных і справядлівых людзей глыбока адчуваючых народнае гора і крыўду, злажыўся гурток (называўся ён Кірыло Мофодзіеўскае Таварыство), паставіўшы сабе мэтай дабіцца скасаваньня прыгону, роўных правоў для ўсіх людзей—ды каб усе славянскіе народы злучаліся у фэдэрацію г. зн. у гэткае адно гасударства у каторым кожны народ сам бы сваімі справамі кіраваў, і каб усюды па школах і урадовых інстытуціях была заведзена родная мова. Шэвчэнко усей душой спагадаючы гэткім думкам, так сама належаў да гэтаго таварыства.

У 1847 г. Шэвчэнко разам з другімі хаўрусьнікамі гуртка арэштавалі. Усіх іх сурова пакаралі, Шэвчэнку пакаралі цяжэй як другіх, дзеля таго, што у яго паперах знайшлі нецэнзурны верш „Сон“. Дзеля гэтаго паэту аддалі у салдаты і саслалі аж у Арэнбург.

Даўная Мікалаеўская салдатчына не раўня цяперэшняй. Надта цяжкое жыцьцё пачалася для Шэвчэнкі. Мучылі яго усе казарменные парадкі ды муштры, мучыла журба за родным краем, але найцяжэй было тое, што яму забаранілі пісаць і малеваць. С часам Шэвчэнка перэвялі у другое мейсцэ, дзе яму было ужо лягчэй жыць і тамака мог паэт пісаць, ды і на муштру не хадзіў. Але найшоўся афіцэр каторы данёс аб гэтым начальству—паэта саслалі ізноў у далёкую крэпасць і тамака ён ужо аніякай змогі ня меў пісаць і малеваць. Гэтак пражыў Шэвчэнко цэлых сем гадоў. Праўда у 1855 г. яму дазволілі пісаць але толькі па расейску, а не па украінску ды і тое пад даглёдам афіцэра. На волю пусьцілі паэта аж у 1857 г. Усяго праслужыў у салдатах ён 10 гадоў і чатыры месяцы. Цэлых 10 гадоў праслужыў нешчасны паэт. У салдаты яго узялі вясёлым, крэпкім, бадзёрым; вярнуўся ён адтуль зусім лысым, с сівой бара-

торая кажэ: „будзь тым, або тым, але сабой быць ня можэш“.

Будзь маскалём, будзь палякам, але калі захочэш астацца беларусам — вымірай, станься „нячыстым“, да сьмерці „хамам“.

Хто знае гэту хамскую палітыку і філасофію нашых культурнікоў і нашых адступнікоў, той паўтараю. нічому ня здзівцца, які-б страшны факт не сустрэціў з жыцьця белаларусоў.

Ці можэ дзівіць сьвядомаго беларуса факт, што яго браты сталіся таварам, каторы прадаецца па 80 руб. за галаву на бойню у Конго?

Не, бо гэта не мінуча павінна стацца з народам пастаўленым у такіе варункі як нашы.

Пад канец XIX сталецьця у Амэрыцы была вайна з мільёншчыкамі колоністамі, каторые на ганьбу ўсяму культурнаму сьвету вялі торг людзьмі, гандлявалі нявольнікамі. Амэрыканская вайна вызваліла чорнаскурых ад нявольніцтва але іх мейсцо занялі цяпер... беларусы!

Уцекаюць добравольна беларусы ад братняй няволі к чужым, і прадаюць іх у няволю, на пэўную сьмерць, і я скажу — лягчэй моўча паміраць паміж чужых, у чужой няволі, як на магілах бацькоў сваіх, пад насмешкі і здзекі сваіх

І плыве наш народ са сваей зямлі, са сваіх хат, ад магіл бацькоў і прадзедоў, на немінучую сьмерць, на чужыну

Бо дома ён галодзен душой і целам, бо дома ён горш нявольніка асьмеян і абезправен, бо дома ён „нячысты“, нават для родных сыноў сваіх.

Каб зразумець вялікую народную трагедію беларуса, трэба унікнуць у падсьвядомую псыхологію народу, трэба зразумець, што кожны бацька чэкае з дня на дзень калі яго сын, або дачка адзене «панскую» сьвітку і скажэ бацьку, што ён «начысты» і каб не прыбліжаўся да іх бліжэй як на 10 крокоў!..

Крыўджэны, безпраўны, беларус ня можэ нават у сваей мове пажаліцца Богу, бо мова яго „нячыстая“ і выкінута с цэрквоў і касцёлоў там дзе крывёй яго і потам паліта зямелька.

І ці трэба дзівіцца, калі пачуецця, што бацька беларус вырэзае нялетак дзяцей сваіх і што людзі уцекаюць са старонкі дзе радзіліся?

**Юры Вераштака.**

# Песьняр чыстый красы.

У канцы краю Расейскай зямлі —здалёк ад роднай старонкі—сплетаў песьняр свой „Вянок“ с „шчырых думак і чуцьця“.

Захаваў ён у сваей чулай на ўселякае хараство душы „краскі, сьвежые калісьці“; з іх тварыў прыгожые абразы далёкай Бацькаўшчыны і ўліваў пачуцьцё і душу ў тое, што жыло калісь і замёрла, ды толькі сьлед у гутарках-легендах народных пакінуло, у творах даўных майстроў-артыстоў адбіваецца.

Не здарма на першай страніцы сваей кніжкі звертаецца Максім Богдановіч да чытачоў сваіх з гэткімі славамі:

> Вы, хто любіця натрапіць
> між страніц старых, пажоўклых
> кнігі, ўжо даўно забытай,
> блеклы, высахшы лісток, —
> праглядзіца гэты томік...

Запраўды: чытаць вершы Богдановіча павінны толькі тые, хто разумее музыку слова, чыя душа бачыць хараство ў чыстай паэзіі.

Богдановіч любіць родну старонку, любіць свой народ беларускі. Здалёк глядзіць ён на родные вёскі і ўсюды бачыць панаваньне гора і бяды: „хваляй шырокай“ разлілося горэ па ўсей зямлі, „родны наш край затапіло“. І з грудзей песьняра рвецца крык-кліч: „Брацьця! ці зможэм громадзкае горэ? Брацьця! ці хваце нам сілы“?.. Сілы хваце—песьняр верыць у гэта. Ен глядзіць у мінўшчыну, як „нашых дзедаў душылі обшары лясоў“, як „яны тые пушчы звадзілі агнём“, і радзіць браць прыклад „з гэтых дзедаў суровых, не хіліцца з бяды, не пужацца агня“. Ен верыць, што і ў нас усплывуць з дна захаваные тамака пэрлы, і раўнуючы народ да мора, клічэ:

> Удар, цыклон, удар на морэ,
> цалуй яго ў глухое дно,
> ўсплясьні ваду, — і пэрлаў горы
> на бераг выкіне яно!...

Але не грамадзкіе тэмы займаюць глаўным чынам паэта: ён перш за ўсё шукае чыстай красы і ў тэй дзяўчынцы васьмілетняй што, пахіліўшыся с трывогаю над плачучым брацікам, выяўляе песьняру тайну Мадонны Рафаэля („Мадонны“), і ў народнай веры ў лясуноў і русалак ды вадзянікоў, („У зачарованым царстві“), і ў абразох роднай прыроды, і ў страніцах мінуўшчыны („Старая Беларусь).

Богдановіч—сьведомы паэт: ён ня толькі пачувае красу, — ён яе разумее. І—каб перэказаць нам яе — падбірае такіе словы і абразы што папраўдзі выклікаюць у нашай душы шчыры отклік. Усё у яго выходзіць ў такіх мяккіх тонах, бытцым на старых тканінах-гобэленах; ўсё сагрэта шчырым пачуцьцём, ды ўсе гэта жыве, выдаецца рэальным.

Лясун калышыцца на тонкаствольных соснах, і здаецца, бытцым чутно яго граньне... У срэбных праменьнях месяца купаюцца русалкі і расплетаюць сваe косы.— на дне рэкі—ў ціне, ў вечнай цішы – сьпіць сівавусы, згорблены вадзянік адвечным сном: аб ім ужо ніхто ня помніць... Чуецца шэлест вужоў, што на Ўзьвіжэньне—ў цёмну восенную ночку—с царом зьмяіным на перадзі паўзуць праз лясы і палі „на зімовы цёплы вырай“.. З далёкай мінуўшчыны паўстаюць жывые абразы „Летапісца“ і „Перапісчыка“; вясковые дзеўчаты, у панскі двор узятые „ткаць залатые паясы“, кідаюць праз шыбы сумны, тужлівы пагляд за вакно — туды, „дзе расцьвіла весна, дзе блішчэ збожжэ ў яснай далі, сінеюць міла васількі“,—і „тчэ, за быўшыся, рука заміж пэрсідзкаго узору цьвяток радзімы васілька“...

Богдановіч умее ўсё ажывіць, перэтварыўшы па своему. І лёгка ліюцца яго вершы кунштоўнай, філіграннай работы, а кожын формай падходзіць да думкі Думак тых—багата, і вось бачым у „Вянку“ вершы такой формы, такой будовы—часта вельмі рэдкай, якой могуць пахваліцца толькі найбольш культурные народы з найвышэй развітай літэратурнай мовай, здаецца, калі б наш „песьняр красы“ меў толькі адну мэту: паказаць што беларуская мова можэ развівацца, як мова літэратурная,—дык ён гэтай мэты дайшоў.

„Вянок“—гэта праўдзівая пэрла ў беларускай паэзіі. Раўнаваць Богдановіча ні с кім ня будзем: не затым, што німа лепшых за яго паэтоў (бо такіе ёсць), але затым, што ён ні да каго не падобны Яго душа замкнёная ў сабе, жыве ў нейкім іншым, асаблівым сьвеці — у сьвеці чыстай красы і шчырай паэзіі, ды толькі праз яе глядзіць на нашае жыцьцё — рэальнае, цяжкое, поўнае змаганьі безупыннай працы. І як у летні гарачы дзень у крыстальна чыстай крынічнай вадзе асьвежаецца нашае цела, так асьвежае душу паэзія Максіма Богдановіча.

**Г. Б.**

# Зоры мае сьветлые.

> Зоры мае сьветлые,
> Вы развейця жаль,
> Думку маю вольную
> Панясіця ў даль.
> Ў марах я правёў бы тут
> Увесь ночны час;
> Ўсё глядзеўбы, зорачкі
> Сьветлые, на вас.
> На пуці сьвяціця мне,
> Як той аганёк:
> Я на скрыдлах ночэчкі,
> Паляту здалёк.
> Палячу душою я
> Ў сьветлы, дзіўны край,
> Дзе чароўна. вольна так,—
> Сьвеціцца там рай.
> Набяруся сіл я там,
> Новых сьветлых дум,
> Прыляту ізноў сюды,
> І развею сум.
> І атдам табе я ўсе
> Думкі, краю мой,
> І ізноў с табою тут
> Я зліюсь душой.
> Дык блішчыця ж, зорачкі,
> І развейця жаль,
> Думку маю вольную
> Панясіця ў даль!

**Я. Журба.**

# З Беларусі і Літвы.

## З Віленшчыны.

**М. Вязынь** (Вілейск. пав.).

Дужа цікавую гісторыйку расказаў мне адзін вучыцель. Высь-

дой (хоць меў тады усяго 43 гады) і с прапаўшым на зяўсягды здароўем. Толькі 4 гады пражыў посьле гэтаго Шэвчэнко і памёр ён 26 лютаго 1861 г.

Гаротнае жыцьцё надламало здароўе паэты гэтак, што памёр ён зусім без пары, але ня здолела яно зламаць сілы яго духа. Вярнуўшыся, Шэвчэнко да самай сьмерці шчыра працаваў для дабра роднаго краю, жыва цікавіўся грамадзянскім рухам, каторы тагды у пачатку панаваньня Александра II, быў у Расеі дужа сільны; колькі мог і сам прынімаў у ім учасьцьце,—пісаў вершы, думаў напісаць шмат популярных кніжак для народу у роднай мові (пасьпеў напісаць ён толькі—лемэнтар) і памёр паэта цвёрда веручы у тое, што дажджэ лепшай долі народ.

Мы бачым, што надта многа гора перанёс вялікі паэт на сваім вяку. Бадай ніколі яно не пакідало яго; мала сьветлых дзён бачыў Шэвчэнко. Мучыўся ён будучы у панскім падданстве. Толькі дзеля шчасьліваго здарэньня асвабадзіўся ён адтуль. Каб не сустрэча з Сошэкам—дык так і астаўся бы Шэвчэнко панскім нявольнікам, век бы ён мусіў малеваць платы ці іншую работу рабіць паводле панскаго загаду, так і прапала бы для Украіны і усяго чэлавечэства гэткая сіла.

Праўда, не прапала яна як прападаюць дзесяткамі і сотнямі таленты, а можэ нават і геніі сермяжнікі прыгнечэнные жыцьцём і ня меўшые ніякай змогі дабіцца варункаў, пры каторых іх творчэскіе сілы былі бы выкарыстаны,—праўда, вялікаю спадчыну пакінуў Шэвчэнко, але ці ўсё тое ён зрабіў. што мог бы зрабіць пры лепшых варунках? Цэлых сем гадоў; калі паэт быў у поўным разцвітаньні здароўя і сіл, ён ня мог нічога пісаць; салдатчына так надламала здароўе, што памёр ён маючы толькі 47 гадоў. Каб ня гэта можэ пражыў бы ён шмат болей; толькі на 24 гаду жыцьця асвабадзіўся Шэвчэнко з панскай няволі — вось, трэба толькі успомніць усё гэта і адразу мы зразумеем, што шмат болей мог бы напісаць Шэвчэнко, — болей мог бы даць чэлавечэству пэрлоў сваей творчасьці — каб лепшае меў ён жыцьцё.

II

Хоць тагды, калі пачаў пісаць Шэвчэнко, украінская мова знаходзілася на палажэньні „простай“, акурат так сама як цяпер беларуская,—хоць гаварыў ей толькі працуючы народ, а панство пакінуло яе і перайшло к чужынцам. шмат украінцаў пісьменнікаў пісала па расейску (пісалі гэтак ня толькі не надта выдатные сілы як Капніст, Богдановіч, Наріжный, Гнедіч але і гэткі выдатны—як Гоголь) усёж ткі адразу стаў тварыць Шэвчэнко у роднай мові. Праўда пісалі перад Шэвчэнкам па украінску некаторые нават даволі выдатные пісьменнікі (Котлярэвскый, Квітка-Оснавененко, Гулак-Артемовскій, Гребенка) — але украінскае народнае адраджэньне тагды толькі пачыналося

Тым ня меній адразу паэт дадумаўся да таго, што чужому навучаючыся — свайго чурацца нельга, ды адразу стаў на справядлівы шлях.

Не надта многа напісаў за сваё жыцьцё Шэвчэнко, шмат пісьменнікоў напісало куды болей, але усё ткі „Кобзар“ (гэтак завецца поўны зборнік вершоў Шэвчэнкі) дае нам гэткі ўсесторонны агляд украінскаго жыцьця і яго патрэб, што астаецца толькі дзівавацца с творчэскай сілы абхапіўшай гэткі шырокі кругазор. Багата Шэвчэнкавых твороў дае нам абразкі слаўнай мінуўшчыны украінскаго народу—доўга геройска змагаўшагося з ворогамі „за вольную волю“ пакуль не перэмаглі яны зусім.

> »Де поділось козачэство, —
> Чэрвоні жупаны,
> Де поділась доля, воля,
> Буньчукы. гэтьманы?
> Мовчать горы, грае морэ,
> Могылы сумують,
>
> А над дітьмы казацькымы
> Поганьці панують“.
> („Тарасова ніч“).

Але пры гэтым Шэвчэнко дужа далёк ад кісла салодкаго патрыотызму, ад таго, каб хваліць усё у мінуўшчыне Украйны. Добра бачыць ён і цёмные стороны—разумее, што не адны толькі ворагі са стараны загубілі Украйну, але багата ім памог у гэтым эгоізм гэтманоў і старшын, каторые неміласэрна гнятлі „братів незрячых грэчкосіів“—і не раз гнеўным словам абрушываецца на іх паэт.

Разумее добра Шэвчэнко і тое, што хоць і шмат у роднай гісторыі ёсць момэнтаў успамінаючы каторые сэрцэ спачыне, але усё гэта мінуло і ня вернецца болей.

> „Нэ вэрнэться сподівана
> Нэ вэрнеться воля,
> Нэ воскрэсне козаччына,
> Нэ встануть гэтьманы“.

ад гэтаго усяго асталася толькі слава, каторая

венцалі летась у Судніках народную школу. Панаехало шмат народу, вёрст за 20—30. Усё вучыцелі ды вучыцелькі. Памаліліся. Разышліся „мужыкі“. Сталі балеваць. Гаварылі прамовы. Адзін сьвяшчэннік і кажэ: „Як люба глядзець, што так дружна жывуць народные і царкоўные вучыцелі, што паз'еждж aліся на культурнае сьвята за 30 вёрст і болей“. Добра было слухаць гэто. Але ніхто не заікнуўся сказаць народу якую важную работу вядуць вучыцелі і што трэба іх паважаць і шанаваць. Гдзе там! Затое адзін сьвяшчэннік з амбону гаварыў народу, што народные вучыцелі гэта рэволюціонеры і іх трэба асцерэгацца..

Высьвенцалі і сёлета школы. У Вязыні—царкоўную, у Ярмолічах—народную, дзе вучыцелькай дачка благачыннаго. Але не было таго што летась. З вучыцялёў было ўсяго 2—3 чэлавекі. Затое былі немцы з млына. Можа так і трэба у царкоўных школах? У прамовах хвалілі і крычалі «ура» падрадчыку, мусі затое, што пастроіў школу, узяўшы 2.000 руб. Дык вось як на сьвеці бывае.

*М. Мокры.*

**Нешчаснае здарэньне.**

Ф. Якубоўшчына Крайск. вол. Сын тутэйшаго гаспадара—Пяшка, толька недаўна прыехаўшы з Амэрыкі, меў да прадане рэвольвэр прывезены ім з Амэрыкі, каторы ён заўседы хаваў пад бэлькай Але вось у нядзелю прышоў нейкі ахвотнік купіць яго. Амэрыканін дастаў рэвольвэр с пад бэлькі і стаў яго паказываць—цацкацца, а тымчасам і адцягнуў неяк цыліндэрак, рэвольвэр выстрэліў і папаў як раз у жывот амэрыканіну. Яго хацелі адвязьці у бальніцу, але не давязьлі, бо нідалёка Маладэчна ён даўся. Асталася жонка і двое дзяцей.

*А. Петрашкевіч.*

## З Міншчыны.

**Мінск.**

Наш горад мае 120 тысяч жыхароў і павінен быць культурным цэнтрам абшырнай правінціі; павінен, але ня ёсць дзеля таго, што національная, людаедзкаго заводу, палітыка задушыла усё. Тутэйшая інтэлігенція сядзіць па кутках, не знаходзячы грамадзянскай працы, бо усё чаго не краніся заражэна чэлавеканенавісьніцтвам і людаедзтвам.

Кажуць што у Мінску аткрываюць сельскагаспадарскі інстытут. Што і казаць, рэч патрэбная для хлебаробскай старонкі, але мы навучыліся глядзець як у вялікарасеі увесь час аткрываюць вышэйшые школы і ня верыць каб на нашай нешчасьлівай правінціі усьміхнулося шчацьце.

Тутэйшые чыноўные і національные кругі, не маючы жывой работы, заснаваные павучынай плесьні, забаўляюцца інтрыгамі, плёткамі, капаньнем адны пад другімі ямак і „пераводамі“ то архірэя, то губэрнатара, то паліцмэйстра.

Беларусам не зацьвердзілі «Музыкально Драматычнаго Кружка «Лучынка» па формальных прычынах. Але тутэйшые беларусы пакульшто веруць, што ім ешчэ удасца дабіцца зацьверджэньня.

**Зьвярьё, а ня людзі.**

Некольк і тыднёў таму назад, каля мястэчка Свіслачы меў мейсцо такі нешчасьлівы прыпадак. Тутэйшы жыхар ягомасць У. жаніў свайго суседа. Як водзіцца у такіх разох, ён с шыкам павёз маладых к вянцу у Свіслацкі касцёл. Хіба ведама усякаму якую мы маем сёлета зіму і перэправы праз рэкі. Дзеля таго, што праз раку Бярозу ужо небазпечна было перэезджаць, маладые прасілі тутэйшаго ксендза даць ім у гэты самы дзень шлюб, але ксёндз атказаў, ссылаючыся на тое, што калі ён дасць шлюб у сьвята (а гэта прыпадало у сьвяты дзень), то маладые пасьля венца справяць сабе баль, што не згаджаецца з установамі касьцёла. Хаця не хаця прышлося ждаць другога дня, а рэка с часу на час усё станавілася слабей ды слабей. Пасьля шлюбу усе хутчэй сабраліся дамоў, каб ешчэ завідна пераехаць раку. Даехаўшы да ракі усе пазлазілі, а коні пагналі так. Паміма трывогі раку пераехалі шчасьліва, але на том баку трэба было ешчэ перэезджаць возера, дзе і прыключылася беда. Пара коні разам с шарабанам праваліліся пад лёд і пашлі на дно. Збегліся людзі, а рачэй зьвяры у людзкіх пастацях. Замест таго каб як можна хутчэй ратаваць коні, яны стоючы зачалі таргавацца з ягомосьцям У., што ён дасць ім за гэта. Ягомасцю. У. сэрцэ кроўю аблівалося гледзючы, як топяцца яго коні, а бяздушная і бязсэрдэчная кучка зьвяроў—людзей стаяла і чэкала пакуль ён ня выкінуў ім на водку дзесятку рублёў. Тады толькі прыняліся ратаваць, але ужо было запозна, адзін конь утапіўся (добры конь, рублёў 200), другога вырыта вaлі

Тут трэба звярнуць увагу, што у ратаваньні коні быў адзін жыдок, ён першы, без ніякаго торгу, што мінуту рызыкуючы праваліцца пад лёд, як мог ратаваў коні, і калі выцягнулі каня, ён ціха і бяз слова пашоў сабе дамоў, так што ягомасць У. Навет ня ўспеў яму за яго адвагу і помач братнюю падзякаваць. Мы нападаем на жыдоў, але вот вам, хрысціяне, прыклад. Во хто а ня вы меў Бога у сэрцы і пачуцьця людзкога братэрства у душы.

А вас да зьвероў прыраўняць толькі можна.

Але чаго нам лепшаго ждаць ад цёмнаго, споенаго народу, калі і сярод нашай інтэлігенціі ёсць вырадкі. Гэтак адна імасць пачуўшы аб гэтым нешчасці, якое прылучылося я-цю У. не пачырванеўшы сказала: — «Ах, шкада каня, ніхайбы ён сам (Я. У.) і утапіўся». — Цяпер самі разсудзіця хто горшы зьвер, ці гэты цёмны селянін, ці гэта інтэлігентная імасць... А нехта-ж вінават у гэтым.

= За апошніе часы у нашай мейсцовасьці гуляе шайка грабіцелёў, так, гэтые людзі абакралі нідаўна капліцу у Барсучые і у Брадцы. Паліція сілілася злавіць іх, але пакуль што не чуваць каб іх спаймалі. Цікаўна рэч, што яны нападаюць па большай часці на касцёлы.

*Жылака.*

## З Гродзеншчыны.

**Чорная-Весь** (Грод. пав.).

У нас у Чорнай-Весі калісь-то была манаполька, але яе скасавалі валасным прыгаварам, — асталіся піўные крамы ды патайные шынкары і гарэлкі было скольк і каму трэба. Цагельнікі нашы пілі да адвалу.

Хачу некольк і слоў сказаць аб цагельніках. Мне здаецца, што наша Чорная Весь (Гродз губ. Сокольск. павету), ёсць адна з багацейшых вёсак. Тутака толькі што ня кожны чэлавек робіць дахоўку (чэрапіцу), маіць сваю печ для выпалы яе, і кожны прадаець яе ня толькі для вёсак, а і у гарады цэлымі вагонамі і зарабляюць шмат грошы, а загэта ж і шмат пьюць гарэлкі. Будоўлі усе у нас ужо выглядаюць як гарадзкіе: стрэх саламянных саўсім німа, усе будынкі крыты дахоўкай. І едучы праз гэту вёску неяк радасць бярэ угледаючыся на харошые чырвоные дахі, з глінянай дахоўкі.

Людзям развіцейшым энэргічнейшым с паміж нашых селян, добра было-б пабываць у Чорнай-Весі і навучыцца рабіць дахоўку. Білеты трэба купляць на станцію Чорная-Весь (С.-З. дарогі), а адгэтуль ужо усяго 4 вярсты да вёскі Чорнай-Весі. Навучыцца рабіць дахоўку і яе выпаліваць вельмі лёгка і можна за тыдзень усё пазнаць. Умеючы рабіць дахоўку кожны можэ і свае абарваные стрэхі замяніць на дахоўкі і прадаваць на старану, нязгорш зарабляючы. Рабіць дахоўку кожны можэ без затрат на печ, трэба зрабіць каптур і выпаліваць у ім...

Але я пачаў аб гарэлцы. Казаў я ужо, што у нас па скасаваньню манапольк і, асталіся піўные і патайные шынкі, адным словам пьянство цайшло у сямью селянскую ды пад гэты час да нас прыехаў малады ксёндз Шапель. Ен адразу як прыехаў, пачаў вайну проці пьянства. Праз валасны сход дабіўся што прыгаварам селяне пастанавілі зачыніць усе піўные у воласці і абдумалі спосабы змаганьня с патайным шынкарствам. Пастаноўлена было самім гаспадаром пілнаваць, каб у у іх вёсках не было патайных шынкоў. Устаноўлены былі людзі для пілнаваньня за гэтым ня толькі у сваей вёсцы, але і у суседніх сялібах, нават у пасёлку пры вагзалі ёсць устаноўлена цьярозая стража. І вось апошнімі часамі запраўды пачало убываць у нас пьянства.

*Ілюк Чалееускі.*

---

« . . . . . не поляжэ,
Нэ поляжэ а роскажэ,
Що діялось в сьвіты
Чыя правда, чыя крывда
Та чыі мы діты.
Наша думка, наша пісьня
Нэ вмрэ нэ загыне,
От де люды наша слава
Слава Украіны».
(«До Основяненька).

Цяпер зусім другіе ужо часы, другіе патрэбы, нельга на адну толькі мінуўшчыну аглядацца, трэба аб тым што нас акружае, ды як звясьці благое у ім, падумаць. Моцна задумаўся над гэтым Шэвчэнко, не дарма ж ён быў селянскі сын і панскі падданы. Багата даў ён нам твораў малюючых прыгонные парадкі і тагдышняе жыцьцё народу. У расейскім пісьменстве так сама шмат хто займаўся гэтым, але ніхто, с такою глыбіной і сілай ня здолеў намалеваць іх, — як гэта зрабіў вялікі украінскі паэт. Гэта прызнае і расейская літэратурная крытыка.

„Аж страх погано
У тым, хорошому сэлі
Чорнійшэ чорноі зэмлі
Блукают люды, поссыхалы
Сады зэлэні, погнылы
Білэнькі хаты, повалялысь,
Сады бурьянон зарослы.
Сэло пэначэ погоріло
Неначэ люды подурілы
Німы на панщыну ідуть
І діточэк своіх вэдуть
. . . . . .
І не в однім тім сэлі
А скрізь па слаўній Украіні
Людэй у ярма запряглы
Паны лукаві. Гынуть, гынуть
У ярмах лыцарскі сыны.
(«І выріс я на чужыні»).

Гэтак жыў народ тагды у украінскай вёсцы, як і агулам у ўсей Расеі. З гэткімі парадкамі павёў Шэвчэнко няўпынную барадзьбу, і даў у сваіх творах такіе абразкі іх, каторые да глыбіны душы патрасаючы сучасьніка гэтаго,—для дзетак патомных будуць яркай памяткай аб тым, як жылося іх бацьком.

„Вы розбійныкы несыті,
Голодні вороны
По якому праведньёму
Святому закону
І землею всім даною
І сэрдэшным людом
Таргуетэ. Стэрэжітэсь,
Бо лыхо вам будэ.
(Холодный яр).

Гнеўна звертаецца Шэвчэнко да паноў гнятучых сваіх падданых і мала нават задумліваючыхся над тым, ці маюць яны на гэта маральнае права.

Багата злыбеды і непраўды бачыў на сьвеці паэт, але заўсягды верыў ён у тое, што:

„Нэдовго на цім світі
Катам пануваты,
Встане правда—встане воля“.

Горача клікаў Шэвчэнко землякоў сваіх не чурацца роднай мовы і цьвёрда памятаць:

„ . . . . . що мы,
Чыі діты, якых батьків“.

Далей знаходзім мы у Шэвчэнка абразкі ціхога, сямейнаго шчасьця, любоўных перэжываньнёў і т. д.; усё гэта глыбока пранікнута гуманнасьцю, — любоўю да чэлавека, агулам, да ўсіх пакрыўджэных і абяздоленых найболей. Трудна у кароткай газэтнай стацьці нават і перэлічыць усе тые тэмы якіе мы знаходзім у «Кобзары»; ніхто з гэткім талентам не пісаў па украінску, ні перад Шэвчэнком, ні посьле яго. Творы Шэвчэнкі тлумачуць на ўсе эўропэйскіе мовы, на ўвесь сьвет праславіў паэт сваю бацькоўшчыну Украіну.

Нам беларусам, каторые жывём у варунках дужа падобных да украінскіх,—толькі пачынаючым ешчэ тую працу над адраджэньнем свайго краю, якая на Украйне даўно ужо вядзецца, — трэба жыва цікавіцца украінствам і шмат у чым браць адтуль прыклад.

Дужа карыснай для нас будзе і бліжэйшая знаёмасьць з украінскім пісьменствам, каторае яўляецца найболей дэмократычным у сьвеці. Мова украінская дужа падобна да беларускай, беларус бадай што усё напісанае па украінску можэ зразумець. Шэвчэнкаваго „Кобзаря“, кнігу даўно ужо стаўшую Коранам украінства, кожны сьвядомы беларус павінен прачытаць; трэба каб вялікі украінскі паэт папраўдзі стаў і нам бацькам мілым—як гэтаго жадае у сваім вершы Янук Купала.

**Лявон Гмырак.**

